(Амаль) містычная гісторыя на Божае Нараджэнне

Аўтар: А. Яўген Голуб OFMConv
09.01.2022 00:00



Час Божага Нараджэння нездарма лічыцца чароўным: нават самыя звычайныя моманты жыцця становяцца прасторай для сустрэчы з Богам. Гатаванне на вігілійны стол, напрыклад, пераўтвараецца ва ўспамін дванаццаці пакаленняў Ізраэля, што чакалі прышэсця Збаўцы, ці ўсведамленне, што кожная наша вячэра (асабліва тая, званая Літургіяй), трымаецца на фундаменце з дванаццаці апостальскіх цаглін. Гісторыя, якую сёння раскажу адбылася са мною гадоў трынаццаць таму. Яна не зрабіла мяне больш набожным, эмпатычным, адным словам – лепшым чалавекам. Калі па шчырасці, я нават на нейкі час пра яе забыўся.

Раз ці два дагэтуль узгадаў падчас казання на святы і адправіў у “архіў” памяці, каб захаваць у галаве месца на новыя неверагодныя гісторыі. Аднак не так даўно Ангеліна са “Слова Жыцця” звярнулася да мяне з пытаннем, ці не мог бы распавесці чытачам што-небудзь незвычайнае са свайго досведу Божага Нараджэння. А я, узгадаўшы вось гэтую гісторыю, даў згоду, сам сабе здзівіўшыся. † Дык вось, гэта быў звычайны гродзенскі зімовы дзень. Такі наўпрост перадсвяточны, вігілійны. Наша святыня ва ўсю моц упрыгожвалася, ялінкі пахлі хвойным лесам і святам, святары мітусіліся, каб пераспавядаць усіх вернікаў, а апошнія нястомна кружылі вакол, не губляючы надзеі здабыць аплаткі, якімі тым жа вечарам паламаюцца з роднымі і блізкімі з найлепшымі віншаваннямі. А я – брат-студэнт, тады яшчэ на клерыкаце – праходзіў у нашай гродзенскай парафіі сваю душпастырскую практыку. У той дзень практыкаваўся ўсё

больш у цярплівасці і сузіранні, бо заданне мне было дадзена наўпрост святочнае: сядзець у закрыстыі і раздаваць за невялікае ахвяраванне аплаткі вернікам. Час быў позні, узятай загадзя кнігі хапіла на паўгадзіны. У святыні рабілася зябка і, каб сагрэцца, я вырашыў праявіць актывізм ды крыху падмесці падлогу. Менавіта тут пачынаецца тая незвычайная гісторыя.

На апошняй лаўцы ў цалкам пустой святыні з дзіцём на руках сядзела дзяўчына даволі прыгожага выгляду і плакала. Хлопчык, яшчэ зусім маленечкі і моцна ўкутаны, пасапваў, часамі незадаволена хныкаючы. Адставіўшы шчотку, я падышоў бліжэй, прапануючы дзяўчыне падысці ў закрыстыю, дзе ёй і дзіцяці было б хоць крыху цяплей.

“Мы тут ненадоўга, пачакаем трошкі ў касцёле. Дзякую шчыра!” – адказала яна, усміхаючыся праз слёзы.

Магчыма, чакала свайго мужа, тату дзіцяці, бо разпораз углядалася ў экран тэлефона. Калыхала дзіця і нешта жыццясцвярджальнае яму напявала-нашэптвала. Не паспеў распытаць яе пра дэталі. Ды і неяк няёмка было. Праз пару хвілін з’явіліся прагныя аплатак і паразмаўляць парафіяне, таму я вярнуўся да свайго непасрэднага абавязку.

Калі ізноў заглянуў у касцёл, дзяўчыны з дзіцём ужо не было. Можа, тата прыехаў па іх і павёз ва ўтульны цёплы дом? Хацелася б верыць. Але ў чым тады прычына яе амаль бязгучнага плачу? Калі так разважаў, раптам ахапіла мяне дзёрзкая думка: “А што, калі?.. Што, калі гэта Яна дазволіла мне такім чынам стаць відавочцам Яе бязгучных бэтлеемскіх слёз? Дала магчымасць падслухаць кавалак Езусавай калыханкі?”. Каб было зразумела – я хіба апошні ў сусвеце кандыдат на візіянера, а калі б вы спыталіся маіх братоў пра мае містычна-сузіральныя здольнасці, яны б, напэўна, доўга смяяліся. Але…

Я да сёння не ведаю сапраўднага імені той дзяўчыны і прычыны, якая прымусіла яе чакаць з сынам у халодным касцёле. Але дзесьці ў глыбіні сэрца перакананы, што Навароджаны зрэжысіраваў наша спатканне, каб вельмі моцна і яскрава ўсвядоміць мне адну рэч: гэта ўсё сапраўды адбылося. І Звеставанне, і Бэтлеем, і ўцёкі ў Егіпет. Хрост у Іардане ды ўсё, што здарылася пасля. Гэта не заімшэлыя гісторыі старых святароў, не набожныя легенды з пахам маралізму. Гэта – цалкам рэальная Гісторыя, у якой кожны з нас мае свой удзел і сваю ролю.

Проста на хвіліну ўявіце сабе, што было б, калі б Бог пастукаўся ў вашы дзверы з просьбай аб начлезе, менавіта сёння, у небяспечны кавідны час? Што было б, калі б звярнуўся да вас на вуліцы, пачынаючы размову? Калі б незнаёмы з усмешкай ад вуха да вуха працягнуў вам прабітую наскрозь руку на знак супакою падчас Імшы?

А на той момант мне хацелася верыць, што Ён і Марыя бліжэй, чым я думаю, і нашмат больш рэальныя, чым мне здаецца. Ці трэба казаць, што тое Божае Нараджэнне я пражыў крышачку інакш:

не больш набожна ці радасна, але напэўна больш свядома.

У гэтай гісторыі няма маралі, ды яна тут абсалютна непатрэбная. Гэта проста напамін пра тое, што на Вяселлі ў Кане Галілейскай танцавалі, сцены пэўнага дома ў Бэтаніі памяталі размовы да раніцы і плач па сябру, а рыба, згатаваная ля Тыберыядскага возера, была добра прыпраўленай і сакавітай. Усё гэта было на самой справе.